# Прамова тав. К. Т. МАЗУРАВА

Дарагі таварыш Лю Шао-цы!

Дарагія таварышы і сябры з Кітайскай Народнай Рэспублікі!

Дарагі таварыш Брэжнеў!

Дарагія нашы госці!

Дазвольце мне ад імя Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Урада Беларускай ССР горача і шчыра яшчэ раз вітаць вас у сталіцы нашай рэспублікі — горадзе Мінску.

Прыезд у Беларусь нашых кітайскіх сяброў — партыйна-ўрадавай дэлегацыі на чале са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі таварышам Лю Шао-цы з'яўляецца выдатнай падзеяй, яркім праяўленнем дружбы паміж савецкім і кітайскім народамі.

Гэтая дружба навекі сцэментавана адзінствам на асновах марксізма-ленінізма і пралетарскага інтэрнацыяналізму. Яе змацоўвае агульнасць нашых мэт у барацьбе за пабудову сацыялізма і камунізма, за мір ва ўсім свеце.

Дарагія таварышы! Беларускі народ, як і ўсе працоўныя нашага Савецкага Саюза, радуецца вялікім поспехам ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, якіх дасягнуў вялікі кітайскі народ пад кіраўніцтвам сваёй Камуністычнай партыі на чале з таварышам Мао Цзэ-дунам.

Нам прыемна і радасна бачыць, як дзякуючы сацыялістычнай рэвалюцыі Кітай з адсталай у мінулым паўкаланіяльнай краіны імклівымі тэмпамі ператвараецца ў магутную сацыялістычную дзяржаву з сучаснай прамысловасцю, высакаразвітай сельскай гаспадаркай, перадавой навукай і культурай. Мы захапляемся слаўнымі справамі і поспехамі вялікага, таленавітага і працавітага кітайскага народа ў будаўніцтве сацыялізма. Савецкія людзі, працоўныя Беларусі поўныя пачуцця гарачай дружбы да гераічнага кітайскага народа і жадаюць яму новых поспехаў у сацыялістычным будаўніцтве.

Савецкі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і яе Цэнтральнага Камітэта, узначальваемага таварышам Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым, актыўна і паспяхова будуе камуністычнае грамадства. На бяскрайніх прасторах Савецкай краіны кіпіць натхнёная стваральная праца. Размах вялікіх задум і здзяйсненняў ярка бачны і тут, на нашай беларускай зямлі. Беларускі народ поплеч з усімі народамі Савецкага Саюза змагаецца за датэрміновае ажыццяўленне велічнага сямігадовага плана.

Цяпер камунізм перастаў быць марай, ён становіцца рэальнасцю нашага жыцця.

Працоўныя Савецкага Саюза натхнёны тым, што разам з імі поплеч па шляху, асветленым марксізмам-ленінізмам, ідуць вялікі кітайскі народ, народы ўсіх краін сацыялістычнага лагера.

У сусветна-гістарычным мірным спаборніцтве сілы сацыялізма растуць з кожным днём, а сілы капіталізму церпяць паражэнне за паражэннем. Развальваецца ганебная каланіяльная сістэма — апора імперыялізму. Цяпер ужо сілы сацыялізма і міру робяць рашаючае ўздзеянне на міжнароднае развіццё. Яны маюць магчымасць абвуздаць імперыялістаў, калі апошнія адважацца развязаць новую вайну.

Мы ідзём па шляху, указаным вялікімі геніямі чалавецтва Марксам і Леніным, поўныя глыбокай веры ў перамогу нашай агульнай справы, цесна згуртаваныя ў адзіным страі. Непарушны саюз сацыялістычных краін, міжнародная пралетарская салідарнасць — гэта гранітная аснова нашых перамог у барацьбе за камунізм.

Дазвольце мне, дарагія таварышы, абвясціць тост за вялікі кітайскі народ!

За Кітайскую Народную Рэспубліку і яе Старшыню таварыша Лю Шао-цы!

За слаўную Камуністычную партыю Кітая і яе баявы Цэнтральны Камітэт на чале з таварышам Мао Цзэ-дунам!

За вечную, непарушную дружбу паміж кітайскім і савецкім народамі!

* * *

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ